*Я. В. УЛАСАВЕЦ*

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВІЛЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА АЛЯКСАНДРА ДАМЕЙКІ

У канцы 1850-х - пачатку 1860-х гг. у літоўскіх і беларускіх губернях значна павысілася значэнне прадвадзіцеляў дваранства, пры дапамозе якіх мясцовая дваранская карпарацыя спрабавала сфарміраваць новыя прынцыпы адносін з расійскім урадам. Гэта вымушала прадвадзіцеляў дваранства дзейнічаць вельмі асцярожна, каб не выклікаць рэпрэсіі з боку ўрада. Прыкладам такой узважанай палітыкі з'яўляецца грамадска-палітычная дзейнасць віленскага губернскага маршалка Аляксандра Дамейкі. Паспяхова лавіруючы паміж інтарэсамі мясцовага набілітэту і расійскага ўрада, ён стаў адзіным губернскім прадвадзіцелем, які змог пазбегнуць рэпрэсій, пачатых пасля падаўлення паўстання 1863 г., і працягваў займаць гэту пасаду да канца жыцця (1878).

In the late 1850-th — early 1860-th the role of marshals of nobility was risen in the Belarusian and Lithuanians provinces of Russian Empire. Local corporations of nobility tried to form new principles of relations with the Russian government through the instrumentality of their marshals. They functioned very discreet, because it can be entail repressions of government. Activity of Alexander Domejko, marshal of nobility of the Vilna province, was example of such reasonable politics. He maneuvered between interests of the Russian government and local nobility very successfully and therefore he is preserved his post since 1855 to 1878.

*Ключавыя словы*: паўстанне 1863 г., самакіраванне, правадзіцелі дваранства.

*Keywords*: January uprising 1863, local goverment, marshals of the Nobility.

Наступіўшая пасля смерці Мікалая I лібералізацыя ўсяліла ў дваранства літоўскіх і беларускіх губерняў надзею на адмену абмежавальных законаў, уведзеных пасля падаўлення паўстання 1830—1831 гг. Рэалізацыю сваіх патрабаванняў дваранства ўскладала ў першую чаргу на прадвадзіцеляў дваранства, якія, паводле расійскага заканадаўства, мелі права падаваць на імя імператара адрасы і петыцыі, якія датычыліся мясцовых патрэбнасцей. Гэткая сітуацыя значна ўзвышала становішча прадвадзіцеляў, але пры гэтым і ўскладняла яго. Справа ў тым, што прадвадзіцелі дваранства выконвалі ролю пасрэдніка паміж дваранскім саслоўем і расійскай адміністрацыяй, бо прадвадзіцелям даводзілася, з аднаго

**Уласавец Яўген Вячаслававіч** — аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

боку, задавальняць патрабаванні абраўшага іх дваранства, а з другога — выкарыстоўваць усе свае здольнасці, каб не перайсці дазволеную мяжу, што магло выклікаць рэпрэсіі з боку ўрада [7, с. 35].

Адной з найбольш цікавых асоб з ліку прадвадзіцеляў дваранства быў Аляксандр Дамейка. Ён нарадзіўся 7 верасня 1804 г. у сям'і былога мсціслаўскага мечніка, а пасля падзелаў Рэчы Паспалітай вілейскага падкаморага Т. Дамейкі. Падчас навучання ў Віленскім універсітэце ўдзельнічаў у таварыстве філарэтаў, але без асаблівых для сябе наступстваў. Бо ўжо праз 8 гадоў, у 1832 г., быў абраны дваранствам і зацверджаны ўрадам на пасадзе вілейскага павятовага прадвадзіцеля дваранства, а ў 1834 г. атрымлівае прыдворнае званне камер-юнкера [19, s. 294]. Не апошнюю ролю ў хуткім кар'ерным росце А. Дамейкі адыграла яго маёмаснае становішча. Яму належалі размешчаныя ў Вілейскім павеце маёнткі Сітцы, Дзеркаўшчына і Валкоўшчына, у якіх разам налічвалася 633 душы мужчынскага полу [4, с. 10].

У 1855 г. дваране Віленскай губерні абралі яго губернскім прадвадзіцелем дваранства, галоўным чынам каб не дапусціць на гэту пасаду надзвычай непапулярнага князя І. Агінскага. Аднак усё астатняе жыццё А. Дамейкі было звязана з пасадай віленскага губернскага прадвадзіцеля дваранства [15, s. 433].

Адразу пасля абрання А. Дамейка апынуўся ў цэнтры грамадска-палітычнага жыцця. Справа ў тым, што на мяжы 1855 і 1856 гг. адбылася масавая падача адрасоў. Першымі падалі адрас памешчыкі Віленскай губерні на чале менавіта з новаабраным губернскім прадвадзіцелем А. Дамейкам. У адрасе вельмі баязлівым і пакорлівым тонам выражалася спадзяванне, што Аляксандр II адновіць хаця б частку правоў, адабраных падчас панавання яго бацькі. Пры гэтым дваране патрабавалі дазволу: 1) рамантаваць старыя і будаваць новыя касцёлы з утварэннем пры іх парафій; 2) выкладаць у школах на польскай мове; 3) аднавіць дзейнасць універсітэта. Адрас быў перададзены ў Пецярбург праз віленскага генерал-губернатара Д. Бібікава, які за гэта атрымаў дакор з боку цэнтральнай улады, а сам адрас не быў прыняты расійскім царом і быў вернуты назад, з пісьмовым уведамленнем, што цар, ведаючы змест, аддаў загад адаслаць яго з выказваннем свайго незадаволення [25, s. 33].

Справа, звязаная з аднаўленнем універсітэта, атрымала чарговы віток у сувязі з візітам Аляксандра II у заходнія губерні, які адбыўся ў 1858 г., падчас падарожжа ў царства Польскае. Аднак ніякіх саступак з боку імператара не адбылося.

На губернскім сходзе ў Вільні на пачатку 1859 г. ізноў абмяркоўваўся план падачы адраса, аднак А. Дамейка, пад ціскам новага генерал-губернатара У. Назімава, здолеў пераканаць дваран у тым, што публічнае выступленне з падобнай ініцыятывай заўчасна і што намнога больш паспяховай будзе просьба аб адкрыцці ў Вільні школ з выкладаннем гаспадарчых і тэхнічных прадметаў. Пры гэтым ён падкрэсліваў, што карысней будзе не накіроўваць петыцыю ў Пецярбург, а надаць яму спецыяльныя паўнамоцтвы дзеля ўладжвання гэтай справы, бо толькі яго непасрэдны ўдзел гарантуе максімальнае паскарэнне ўсіх працэдур ва ўрадавых органах у сталіцы і атрыманне чакаемага выніку [25, с. 50].

Другі візіт Аляксандра II, які мусіў адбыцца восенню 1860 г., таксама планавалася выкарыстаць дзеля дасягнення сваіх мар. Група памешчыкаў Ковенскай губерні звярнуліся да свайго губернскага прадвадзіцеля Ю. Доўгірда з прапановай падаць імператару падчас балю адрас, на што атрымалі ад апошняга згоду. У адрасе ўтрымліваліся патрабаванні аднаўлення ўніверсітэта і вяртання былой ролі польскай мовы ў сістэме адукацыі, судзе і адміністрацыі. Цікавай падаецца канцоўка петыцыі, у якой утрымлівалася недвухсэнсоўнае спадзяванне, што падчас праўлення Аляксандра II здзейсняцца дадзеныя яшчэ яго дзедам, Аляксандрам I, абяцанні. Відавочна, што на ўвазе мелася аб'яднанне заходніх губерняў з царствам Польскім [18, s. 24—25; 19, s. 82—85].

Аляксандр Дамейка першапачаткова пагадзіўся падтрымаць ініцыятыву дваранства, аднак у дзень прыезду імператара адмовіўся ад свайго абяцання, што прымусіла і астатніх прадвадзіцеляў узяць прыклад з яго. Варта адзначыць, што адрас быў не больш чым палітычнай дэманстрацыяй, якая павінна была падкрэсліць, што «тут не Расія і што польскае дваранства ніколі не адмовіцца ад сваіх мараў». На што імператар, пасля таго як даведаўся аб змесце адраса, заявіў А. Дамейку, запрошанаму на абед: «Тут не Польша, а ў дваранства ёсць толькі адзін шлях — здабыць маю літасць» [14, с. 95]. Гэты адказ выклікаў раздражнёнасць мясцовага дваранства, што ў сукупнасці з падзеямі пачатку 1861 г. у царстве Польскім спрычынілася да моцнай хвалі маніфестацый, якія ахапілі літоўскія і беларускія губерні. Аднак А. Дамейка і на гэты раз праявіў сябе як выключна разважлівы дзеяч, які адчуваў, што публічныя дэманстрацыі прыносяць больш шкоды, чым карысці, бо падштурхоўваюць урад да рэпрэсій. Таму А. Дамейка звычайна трымаўся на адлегласці ад іх, што добра бачна на прыкладзе паніхіды ў касцёле Святога Яна, арганізаванай віленскім павятовым прадвадзіцелем дваранства Янам Тышкевічам 2 сакавіка 1861 г., на якую прыйшоў без запрашэння і А. Дамей-

ка, але толькі каб сваёй прысутнасцю ўстрымаць тых, хто імкнуўся перайсці рысу дазволенага [1, с. 26—27; 11, с. 56; 21, s. 30; 22, s. 25; 25, s. 82—83].

Такая пазіцыя А. Дамейкі спрычынілася да прадпрынятай у 1861 г. па ініцыятыве Hôtel Lambert спробы ўплываць на дзейнасць віленскага губернскага прадвадзіцеля дваранства з мэтай прыцягнення яго да апазіцыйнай працы. Адзін з агентаў прыслаў у Парыж праект ліста, які пасля дапрацоўкі неабходна было накіраваць поштай да А. Дамейкі, а копіі паслаць павятовым прадвадзіцелям Віленскай губерні з тым, каб распаўсюдзіць у памешчыцкім асяроддзі дакоры ў бок А. Дамейкі. Абвінавачвалі яго, між іншым, у невыкананні сваіх перадвыбарных абяцанняў, а таксама ў невыкарыстанні спрыяльных умоў дзеля паляпшэння становішча шляхты Віленскай губерні. Асаблівая ўвага акцэнтавалася на грэбаванні Дамейкам агульнай справай дзеля ўласных інтарэсаў падчас вырашэння сялянскага пытання і паралізавання дзеянняў ковенскага і віленскага дваранства ў справе падачы адраса Аляксандру II у 1860 г. [17, s. 94—95; 25, s. 519—521].

Паказальна, што ў тым жа красавіку Аляксандр Дамейка атрымаў з Бабруйска канверт за подпісам Э. Габрыэля, у якім была вершаваная адозва «Odezwa syna ojczyzny do braci Litwinów» («Адозва сына радзімы да братоў-літвінаў»). Яе аўтар (як выявіла следства, ім быў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч) звяртаецца да губернскіх і павятовых прадвадзіцеляў дваранства з заклікам падштурхнуць суайчыннікаў да падання Аляксандру II і Напалеону III адраса, па прыкладзе дваран царства Польскага, а потым «змагацца з ворагамі без зброі, без войскаў, адным толькі аднадушным імкненнем да аднаўлення Польшчы» [10, с. 54—56, 79, 236— 237].

Чуткі аб гэтым дайшлі і да генерал-губернатара У. Назімава, які 7 красавіка падчас прыватнай размовы запытаў у А. Дамейкі, ці праўда, што дваране збіраюцца падаць нейкі адрас, на што апошні адказваў, што ніякага адраса не будзе [10, с. 14].

Аднак некаторы ціск на А. Дамейку, відавочна, быў. Справа ў тым, што расчараванне дваранства ў асобе імператара праявілася не толькі ў маніфестацыйным руху, але ў адмове ад легальнай дзейнасці, што прывяло да стварэння арганізацыі «белых», якая канчаткова сфарміравалася ўжо ў траўні 1862 г. на з’ездзе ў Вільні, куды з нагоды традыцыйных кірмашоў прыбылі прадстаўнікі з шасці беларускіх і літоўскіх губерняў. Афіцыйным «прыкрыццём» пасяджэння, якое пачалося 10 траўня, было абмеркаванне Земскага крэдытнага таварыства. Сярод удзельнікаў з’ез-

да былі ўсе, за выключэннем ковенскага, губернскія прадвадзіцелі дваранства: віленскі А. Дамейка, гродзенскі граф В. Стажэньскі, мінскі А. Лапа, магілёўскі князь С. Любамірскі, і замест віцебскага — дынабургскі павятовы прадвадзіцель С. Плятэр-Зіберг. Імі быў абраны Часовы камітэт на чале з А. Дамейкам [24, s. 322; 25, s. 518].

На лістападаўскім з'ездзе выявіліся тыя ідэйныя разыходжанні, што былі закладзены яшчэ на травенскім з'ездзе. А. Дамейка не мог пагадзіцца з дамінаваннем групоўкі Я. Гейштара, якая адмаўляла праекты легальных дзеянняў, скіраваных на замірэнне з урадам. Да таго ж дзеянні Я. Гейштара насілі эгалітарны характар і спрыялі радыкалізацыі поглядаў, у той час як А. Дамейка быў прыхільнікам элітарнай канцэпцыі, арыентаванай на кансерватыўнае кола буйных памешчыкаў. З-за гэтага Аляксандр Дамейка адмовіўся ўдзельнічаць у працы з'езда і патрабаваў, каб да яго прыйшлі губернскія прадвадзіцелі дзеля паразумення. Аднак перамовы з В. Стажэньскім, А. Лапай і С. Плятэр-Зібергам не прынеслі станоўчага выніку. У сувязі з гэтым дваране пастанавілі лічыць учынак А. Дамейкі антыграмадзянскім і абралі замест яго К. Гяцэвіча, былога вілейскага маршалка [18, s. 36; 19, s. 175—178].

З прызначэннем на пасаду віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва сітуацыя ў беларуска-літоўскіх губернях кардынальным чынам мяняецца. Ваенны разгром паўстанцкіх сіл, збольшага завершаны пры У. Назімаве, М. Мураўёў дапоўніў шэрагам мерапрыемстваў, скіраваных на ўмацаванне расійскай адміністрацыі і аднаўленне падарванага прэстыжу ўлады. Асобна трэба вылучыць распачатую летам 1863 г. кампанію па складанні вернападданніцкіх адрасоў на імя Аляксандра II, якія, на думку М. Мураўёва, павінны былі паказаць Еўропе, што «польская» справа незваротна прайграна. Пры гэтым дваранства беларуска-літоўскіх губерняў павінна было адрачыся ад сваіх сепаратысцкіх намераў і прама заявіць, што «Западный край есть край Русский» [13, с. 30].

Ініцыятыву М. Мураўёва падтрымаў і віленскі губернскі прадвадзіцель дваранства А. Дамейка. Ён добра разумеў, што паўстанне асуджана на паражэнне, а таму імкнуўся выратаваць сябе і іншых дваран ад непатрэбных і бессэнсоўных рэпрэсій, якія ад упартага супраціўлення толькі б павялічваліся [16, s. 78; 20, s. 144; 23, s. 53—54].

Аднак пазіцыя А. Дамейкі выклікала хвалю супраціўлення як з боку звычайных дваран, якія лічылі такі ўчынак ганебным, так і з боку прадстаўнікоў паўстанцкіх улад, для якіх падпісанне адраса было падобна краху, бо азначала, што мясцовае дваранства перад усёй Еўропай галосна абвяшчае аб пераходзе да супрацоўніцтва з расійскім урадам.

У сувязі з такім становішчам рэвалюцыйныя ўлады спрабавалі аказаць уплыў на А. Дамейку, дзеля чаго арганізавалі шэраг акцый. Сярод памешчыкаў быў распачаты збор подпісаў, скіраваны на адхіленне А. Дамейкі ад займаемай пасады. Тайны рэвалюцыйны ўрад Віленскага павета 13 чэрвеня абвясціў А. Дамейку, за супрацоўніцтва з уладамі, здраднікам і паставіў па-за законам. Марнасць спроб адхіліць А. Дамейку ад улады альбо паўплываць на яго пазіцыю спрычынілася да таго, што 26 ліпеня 1863 г. член Выканаўчага аддзела Літвы, паўстанцкі начальнік г. Вільна У. Малахоўскі прыгаварыў А. Дамейку да смяротнага пакарання [3, с. 147; 10, с. 206].

Нягледзячы на супрацьдзеянне і пагрозы з боку паўстанцкага кіраўніцтва, А. Дамейка не адмовіўся ад запланаванай падачы адраса. У гэтай справе яму дапамагала групоўка ўплывовых памешчыкаў Віленскай губерні, сярод якіх былі віленскі і свянцянскі павятовыя прадвадзіцелі дваранства А. Плятэр і Г. Свянціцкі [6, с. 306; 9, с. 41; 17, s. 251—252].

Аднак сярод прадвадзіцеляў дваранства знаходзілася шмат праціўнікаў падання адраса. Трокскі павятовы прадвадзіцель дваранства Л. Яленскі выступаў супраць падпісання адраса, распрацаванага А. Дамейкам, бо меў свой варыянт, у якім прапусціў найбольш ганебныя для дваранства выразы. Аднак А. Дамейка паведаміў, што М. Мураўёў не пагодзіцца прыняць ніякі іншы варыянт. Прычым як толькі віленскі генерал-губернатар даведаўся аб апазіцыі з боку Л. Яленскага, то адразу ж падпісаў загад аб высылцы яго ва ўнутраныя губерні Расіі. Такі ж лёс напаткаў вілейскага павятовага прадвадзіцеля дваранства М. Тукалу [17, s. 252].

Звальненне з пасад і высылка ў Сібір прадвадзіцеляў дваранства моцна ўразіла віленскае дваранства. У выніку 27 ліпеня 1863 г., у дзень нараджэння імператрыцы, дэпутацыя на чале з А. Дамейкам прадставіла М. Мураўёву адрас на імя Аляксандра II, які першапачаткова падпісалі 235 дваран Віленскай губерні [2, с. 648; 3, с. 43; 8, с. 244; 9, с. 44—45; 12, с. 268].

Праз два дні, 29 ліпеня 1863 г., адбылася спроба выканаць пастанову Выканаўчага аддзела Літвы ад 26 ліпеня аб смяротным пакаранні А. Дамейкі. Нягледзячы на тое, што замах аказаўся няўдалым і віленскі губернскі прадвадзіцель дваранства адкараскаўся нязначнымі ранамі на руцэ, гэтая падзея была настолькі выключнай, што ўзрушыла як польскія, так і рускія грамадскія колы, аб чым сведчыць большасць мемуараў таго часу [5, с. 622—623; 8, с. 245; 9, с. 44—45; 12, с. 268—269; 13, с. 32; 16, s. 78; 23, s. 53—54].

Абвінавачваемы большай часткай польскага грамадства «Заходняга краю» ў баязлівасці, залішняй лаяльнасці, мяжуючы з калабарацыянізмам, і здрадзе агульнанацыянальным інтарэсам, А. Дамейка працягваў карыстацца ўрадавай ласкай і атрымоўваў чарговыя ўзнагароды, займаючы пасаду віленскага губернскага прадвадзіцеля дваранства да самай смерці 28 верасня 1878 г. [19, s. 294].

Лепш за ўсіх аб сваім месцы ў падзеях надзвычай няпростага часу распавёў А. Дамейка ў сваім лісце летам 1862 г.: «Пазіцыя кожнага з губернскіх маршалкаў, а тым больш прадстаўніка ў Вільні, была важнай. [Ковенскія] Маршалкі, губернскі Доўгірд і павятовы Жылінскі, былі выдалены. Віленскі павятовы Ян Тышкевіч таксама быў адхілены ад абавязку. Гродзенскі губернскі Ажэшка падаў у адстаўку, павятовы Лахніцкі памёр. Я адзіны, пад уціскам адных і другіх, з пасады не сайшоў; але страціў здароўе» [25, s. 520].

Такім чынам, асоба віленскага губернскага прадвадзіцеля А. Дамейкі безумоўна вельмі спрэчная і неадназначная, добра ілюструе сітуацыю, у якой у канцы 50-х — пачатку 60-х гг. XIX ст. апынулася большасць выбарных прадстаўнікоў ад дваранскай карпарацыі беларускіх і літоўскіх губерняў, калі перад імі паўстала неабходнасць выбіраць паміж інтарэсамі мясцовага набілітэту і абавязкамі, ускладзенымі на іх расійскім урадам. Паспяхова лавіруючы паміж інтарэсамі мясцовага набілітэту і расійскага ўрада, А. Дамейка стаў адзіным губернскім прадвадзіцелем, які здолеў пазбегнуць рэпрэсій, распачатых пасля падаўлення паўстання 1863 г., і працягваў займаць пасаду да канца жыцця.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Белецкий А.* Сборник документов музея графа М. Н. Муравьёва. Вильна : Тип. «Русский почин», 1906. LXXXIX. 233 с.
2. *Брянцев П. Д.* История литовского государства с древнейших времен. Вильна : Тип. А. С. Сыркина, 1889. 659 с.
3. Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. : материалы и документы; редкол. : В. Дьяков [и др.]. М. : Наука, 1965. LIII. 583 с.
4. Извлечение из описаний помещичьих имений в 100 душ и свыше. Виленская губерния. Б. м., б. г. 40 с.
5. *Имеретинский Н. К.* Воспоминания о графе М. Н. Муравьеве // Исторический вестник. 1892. № 12. С. 603—643.
6. *Комзолова А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М. : Наука, 2005. 383 с.
7. *Корелин А. П.* Институт предводителей дворянства. О социальном и политическом положении дворян // История СССР. 1978. № 3. С. 31—48.

8. *Милютин Д. А.* Воспоминания генерал-фельдмаршала графа Дмитрия Алексеевича Милютина. 1863—1864 / под ред. Л. Г. Захаровой. М., 2003. 688 с.

9. *Мосолов А. Н.* Виленские очерки 1863—1865 гг. (Муравьёвское время). Спб. : Тип. А. С. Суворина, 1898. 253 с.

10. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861 и 1862 гг. : материалы и документы / редкол. : В. Дьяков [и др.]. М. : Наука, 1964. LXXI. 707 с.

11. *Смирнов А. Ф.* Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М. : Изд-во АН СССР, 1963. 390 с.

12. *Цылов Н. И.* Дневник члена Виленской политической комиссии при графе Муравьеве: 1863—1864 гг. // Русский архив. 1906. № 3. С. 216—299.

13. *Черевин П. А.* Воспоминания: 1863—1865 гг. Кострома : Тип. «Северный рабочий», 1920. 76 с.

14. *Шпопер Д.* Политические инициативы польской шляхты в Западных губерниях Российской империи накануне восстания 1863 г. // Отечественная история. 2006. № 3. С. 90—103.

15. *Bairašauskaite T.* O litewskich marszałkach gubernialnych i powiatowych (do 1863 r.) // Przegląd Wschodni. 1997. T. IV. Z. 2 (14). S. 427—441.

16. *Ehrman J.* W Wilnie i Surwiliszkach na początku XX wieku // Magazin Polski. 1999. № 2—3 (16—17). S. 77—82.

17. *Fajnhauz D.* 1863: Litwa i Białoruś. Warszawa : Neriton, Instytutu Historii Polskiej Akademii Nauk, 1999. 357 s.

18. *Gieysztor J.* Litwa przed rokiem 1863. Lwów : Nakładem Drukarni Ludowej, 1888. 42 s.

19. *Gieysztor J.* Pamiętniki z lat 1857—1865. T. I. Wilno : Tow. Udz. «Kurier Litewski», 1913.

20. *Kieniewicz S.* Dereszewicze 1863. Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1986. 191 s.

21. *Łaniec S.* Litwa i Białoruś w dobie konspiracji i powstania zbrojnego (1861—1864). Olsztyn : Ośrodek Badań Naukowych im. Wojciecha Kętrzyńskiego w Olsztynie, 2002. 196 s.

22. *Łaniec S.* Powstanie stzcyniowe na Litwie. Olsztyn : Historii Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego, 2000. 172 s.

23. *Milewski-Korwin H.* Siedemdziesiąt lat wspomnień (1855—1925). Poznań : Księgarnia Uniwersytecka, 1930. 600 s.

24. *Ramotowska F.* Narodziny tajemnego państwa Polskiego 1859—1862. Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1990. 477 s.

25. *Szpoper D.* Pomiędzy caratem a snem o Rzeczypospolitej. Myśl polityczna i działalność koserwatystów polskich w guberniach zachodnich Cezarstwa Rosyjskiego w latach 1855—1862. Gdańsk : Wydawnictwo Uniwersytetu Gdańskiego, 2003. 626 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 15 ліпеня 2012 г.